Падтрымай "Вясну" на PATREON

Палітвязня Аляксея Ліпеня асудзілі за паўгады у чацверты раз

07.09.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Аляксей Ліпень

У судзе Заводскага раёна 7 верасня разглядалася чарговая крымінальная справа, заведзеная на Аляксея Ліпеня за абразу службовай асобы (арт. 369 КК РБ).

Дагэтуль яго судзілі за абразу супрацоўнікаў міліцыі ў сацыяльных сетках тройчы: 13 красавіка, 31 мая, і 15 ліпеня. Агулам быў асуджаны на 5 год абмежавання волі ва ўстанове адкрытага тыпу.

Крымінальныя справы былі заведзеныя за тое, што на працягу двух месяцаў Аляксей пакідаў абразлівыя каментары і пагрозы ў адрас міліцыянтаў ў адным з тэлеграм-каналаў.

Беларускай праваабарончай супольнасцю Аляксей Ліпень прызнаны палітычным зняволеным.

Новую крымінальную справу разглядае суддзя **Алена Капцэвіч.**

У якасці чарговага пацярпелага выступае старшы ўчастковы інспектар міліцыі Светлагорскага РАУС, маёр міліцыі **Аляксандр Перавядзенцаў.**



Аляксея Ліпеня асудзілі на 5 гадоў "хіміі" і вызвалілі ў залі суда

Аляксей Ліпень неаднаразова, выкарыстоўваючы розныя нікнэймы, у тым ліку «савецкі малы», пакідаў абразлівыя каментары пад фота супрацоўнікаў міліцыі ў тэлеграм-канале «Карнікі Беларусі» ў перыяд з 29 кастрычніка па 18 снежня 2020 года.

Пацярпелы на пасяджэнне не з'явіўся з прычыны службовай занятасці і складанай эпідэміялагічнай сітуацыі. Аднак падаў матэрыяльны пазоў за маральныя пакуты ў памеры 3 000 рублёў.

Па матэрыялах следства, 30 лістапада 2020 года ў тэлеграм-канале “Карнікі Беларусі” было размешчана фота Перавядзенцава, а ў яго адрас быў напісаны каментар у абразлівай форме з нецэнзурнымі словамі.

> *“Мне пачалі казаць, што бачылі маё фота. Тады я зарэгістраваўся ў тэлеграм-канале і пабачыў той каментар. Там падпісана 60 000 чалавек,”* – казаў пацярпелы па папярэднім допыце.

Ліпень у судзе тлумачыць:

> *“Я палічыў, што чалавек здзейсніў злачынства, напісаў толькі адно слова і выйшаў з інтэрнэту. Напісаў на эмоцыях. Раскайваюся ў зробленым, але пазоў не прызнаю”.*

Суд пастанавіў пакараць Ліпеня **штрафам у памеры 1 000 руб, без дабаўлення тэрміну абмежавання волі.**

Па ранейшых судах абвінавачаны павінен быў сплаціць кампенсацыю нанесенай маральнай шкоды пацярпелым супрацоўнікам міліцыі ў памеры 5 500 рублёў і судовыя выдаткі ў памеры 522 рублі. Цяпер гэтая сума, з улікам новага матэрыяльнага пазову, істотна выросла.

Твитнуть







Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"


#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ
Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сансетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY